# ПАЛІТЫЧНЫ ДЫСКУРС
# У ІНФАРМАЦЫЙНАЙ І НАВУКОВАЙ СФЕРАХ

***Н. А. Зубчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*

У артыкуле адзначана, што менавіта палітычны дыскурс сёння пераважае ў інфармацыйнай сферы і з'яўляецца неад'емнай часткай сацыяльных адносін; вызначаны напрамкі даследавання дадзенай катэгорыі з улікам тэарэтыка-метадалагічных набыткаў айчыннай школы журналістыкі.

***Ключавыя словы:*** палітычны дыскурс; інфармацыйная сфера; палітычная камунікацыя; журналістыка; навуковая школа.

# POLITICAL DISCOURSE
# IN THE INFORMATION AND SCIENTIFIC SPHERES

***N. A. Zubchonak***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. A. Zubchonak (Zubchon@bsu.by)*

The article notes that it is the political discourse that prevails in the information sphere today and it is an integral part of social relations; the directions of the research of this category are determined, taking into account the theoretical and methodological achievements of the national school of journalism.

***Key words***: political discourse; information sphere; political communication; journalism; scientific school.

У апошні час на інфармацыйным полі не толькі Беларусі, але многіх іншых краін пераважае ў асноўным сацыяльна-палітычны кантэнт, што абсалютна заканамерна ў перыяд абвастрэння міжнародных адносін, сітуацыі ўнутры краін.

Грамадска-палітычная камунікацыя заклікана актуалізаваць і вырашаць самыя актуальныя праблемы: супрацьстаянне розных палітычных напрамкаў, акрэсліваць вострыя сацыяльныя пытанні. Кожны прадстаўнік публічнай сферы ведае, што прафесійнае валоданне адпаведнымі метадамі

і прыёмамі забяспечвае дакладнасць перадаваемай інфармацыі, вызначае ступень яе ўздзеяння на грамадства.

Увага навуковай супольнасці сёння аб’ектыўна скіравана ў бок даследавання асаблівасцяў палітычнай камунікацыі як аднаго з самых запатрабаваных напрамкаў у сучасных грамадскіх навуках. Так, тэрыя палітычага дыскурсу актыўна распрацоўваецца ў лінгвістыцы, філасофіі, паліталогіі, сацыялогіі, журналістыцы і многіх іншых сферах.

Даследчыкі канкрэтызуюць дадзенае паняцце ў дачыненні да кожнага з напрамкаў. Так, шырокавядомым стала азначэнне, прапанаванае галандскім лінгвістам Т. ван Дэйкам, дзе палітычны дыскурс вызначаецца як пэўны клас жанраў, абмежаваных пэўнай сацыяльнай сферай, сферай палітыкі. Рут Водак вызначае дыскурс не толькі як самастойнае даследчыцкае поле, не толькі як метад, але і як сукупнасць тэорый вытворчасці інфармацыі і яе ўспрымання.

Даследчыкі тэорыі дыскурсу актыўна спасылаюцца на працы Фэрдынанда дэ Сасюра, Л. Вуд, Р. Крогера, Я. Бломарта і інш. Сёння ў гэтай сферы шмат навуковых распрацовак расійскіх аўтараў (А. Баранаў, В. Барбоцька, В. Русакова і інш.). У беларускай навуцы дадзены напрамак таксама прадстаўлены шматлікімі працамі.

У той жа час звяртае на сябе ўвагу наступная акалічнасць: тэарэтыка-метадалагічнай асновай для даследаванняў у галіне дыскурсу па-ранейшаму выступае ў асноўным замежная навука. З аднаго боку, гэта аб’ектыўна. Аднак нельга не звярнуць увагу на наступныя акалічнасці: па-першае, за апошнія дзесяцігоддзі дадзеная праблема актыўна распрацоўваецца айчыннымі даследчыкамі (В. Іўчанкаў, В. Лушчынская, І. Ухванава-Шмыгава і інш.); па-другое, заканамерна выпрацавана ўласная метадалогія, якая адрозніваецца ад замежных тэорый. Гэта аб’ектыўная з’ява, паколькі фарміраванне і развіццё камунікацыйнага і інфармацыйнага працэсаў на постсавецкай прасторы вызначалася і вызначаецца ў першую чаргу асаблівасцямі сацыяльна-палітычнага развіцця краіны. Менавіта гэты фактар пераважае ў працэсе адлюстравання розных аспектаў рэчаіснасці на розных этапах гісторыі.

У гэтым кантэксце нельга не адзначыць, на наш погляд, важную акалічнасць: беларуская навуковая думка заўсёды грунтавалася на традыцыі. У айчыннай школы журналістыкі яна таксама існуе. І сёння нельга не ўлічваць вельмі важныя яе набыткі.

У дачыненні да метадалогіі і практычнай рэалізацыі палітычнага дыскурсу даследчыкамі факультэта журналістыкі амаль за 80 год яго гісторыі было зроблена вельмі многа. Шматлікія працы па тэорыі і практыцы сродкаў масавай інфармацыі сёння можна разглядаць як аснову тэорыі палітычнай камунікацыі Беларусі. Патрабуюць новага асэнсаван-

ня работы Р. В. Булацкага, Б. В. Стральцова, А. Г. Слукі, І. І. Сачанкі, М. Я. Цікоцкага і многіх іншых аўтараў, у якіх праз прызму сродкаў масавай інфармацыі прадстаўлены розныя аспекты асэнсавання сацыяльна-палітычных працэсаў свайго часу, вызначаны тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да арганізацыі работы журналістаў (М. Я. Цікоцкі «З гісторыі беларускай журналістыкі ХІХ стагоддзя» (1960); А. Г. Слука «Нацыянальная ідэя» (2008), «Ідэалогія беларускай дзяржаўнасці: метадалогія фарміравання» (2007), «Ідэалагічныя працэсы ў Беларусі» (2010), «Беларуская журналістыка» (2011); Б. В. Стральцоў «Основы публицистики. Жанры» (1990); Р. В. Булацкі, І. І. Сачанка, С. В. Говін «Гісторыя беларускай журналістыкі» (1979) і інш.).

Такім чынам, значэнне палітычнага дыскурсу сёння выходзіць далёка за межы лінгвістычнай сферы. Перспектыўнымі для сучаснай навукі становяцца даследаванні ўзаемадзеяння грамадска-палітычнага дыскурсу і дынамікі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця, распрацоўкі напрамкаў інстытуцыянальнай аптымізацыі беларускага грамадства і эканомікі, распрацоўкі стратэгічных праграм, якія забяспечваюць устойлівае сацыяльна-эканамічнае палажэнне. Праца ў гэтым напрамку актыўна праводзіцца вучонымі факультэта журналістыкі ў апошні час у межах падрыхтоўкі кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Палітычны дыскурс выступае сёння неад’емнай часткай грамадскіх адносін. Перад журналістыкай і журналісцкай адукацыяй сёння стаіць задача распрацоўкі навукова-практычных праграм, накіраваных на падрыхтоўку (экспертызу) інфармацыі, пакладзенай у аснову рэпрэзентацыі афіцыйнага грамадска-палітычнага дыскурсу, што будзе садзейнічаць скарачэнню ўзроўню агрэсіі ў грамадстве, распаўсюджванню сапраўдных сацыяльных і агульначалавечых каштоўнасцей.